# ДАРОГА ДА ДОМУ

Дарога да дому
Заўжды карацей
За самай кароткай
Ад дому сцяжынкі,
Таму, калі маці
Праводзіць дзяцей,
То доўга махае
Ўслед ім хусцінкай.
А потым жыве
Яна марамі сноў,
Чакае гасцей,
Спадзяецца, вядома,
Што дзе мы не будзем,
А досвіткам зноў
Здаровыя прыдзем
Да роднага дому.
І час пралятае —
Збываюцца сны,
Прыходзяць да дому
Былыя гарэзы,
І толькі цяпер
Заўважаюць яны:
“О, колькі ў матулі
Маршчынак-парэзаў! ”
Таму і здаецца
Заўжды карацей
Дорога да дому
Былому салдату,
Бо вельмі чакае,
Правёўшы дзяцей,
Матуля зварот іх
У родную хату.

***

Пакуль паперы аркуш некрануты,
Пакуль на ім не з’я’вяцца радкі,
Спакойна спяць Гародні, Рудні, Гуты
І з выраю вяртаюцца шпакі.

Пакуль паперы аркуш яшчэ чысты,
Вавёрка робіць сдіплы свой запас,
Глушцы з палян зрываюцца са свістам,
І так марудна ўзімку коціць час.

Пакуль паперы аркуш некрануты,
І мы з табой паладзім далібог,
Забудуцда і слёзы, і пакуты,
І дзеці завітаюць на парог.

Пакуль звычайны аркуш сіратліва
Яшчэ ляжыць бялюткі на стале,
Цудоўна ўсім жывецца і шчасліва
І ў заўтрашняе верыцца.

Але Мы страцім і каштоўнасці, і мову,
І шар Зямны ў рокаде гармат,
Як толькі на паперу ляжа слова,
Здавалася б, звычайнае: “Загад...”

## РАЗМОВА З УНУКАМ

— Сцвярджаюць: будзе недарод,
Чакай другога ліха,
Як скіне з дрэва ў агарод
Сваё дзіця бусліха...
А той быў ураджайны год,
Ды спраўдзіла прыкмета:
Таптаў палі фашысцкі бот,
Грымела грозна лета.
Яшчэ жывы быў і Фядот,
Твой дзядзька незабіты...
А над зямлёю плыў смурод —
Гарэла ў полі жыта.
Гаротны стогн матуль, дзяўчат.
І слёзы,
слёзы,
слёзы...
А бежанцаў ад родных хат
Вывозілі абозы.
А нам старым... —
                    і дзед замоўк,
Нат папярхнуўся дымам,
— А як ты вывучыў урок,
Спытае, ўнук, Радзіма.

***

*Бацьку*

Яшчэ за вёскай след варожы
Пад ветрам добра не астыў,
І гул баёў вісеў над Сожам,
І тым пісаліся лісты,

Хто ў першай бойцы рукапашнай
Упаў у мяккі белы снег,
Хто, перажыўшы дзень ўчарашні,
Матулю сніў у цёплым сне...

А вы, падлеткі, што нямногіх
Уратаваў ад кулі лес,
На фронт прасіліся ў падмогу,
А вам сказалі: — у МТС!

І вы пайшлі, хоць без ахвоты,
Не задаволіўшы патрэб,
І зразумелі толькі потым:
Якая радасць —
Родзіць хлеб!

Таму і ўпрэгліся ў работу...
За кругам трактар робіць круг,
Ды ля скарожанага дзота
На міну натыкнуўся плуг...

Прыйшоў ў прытомнасць у палаце
Пад вечар юны трактарыст,
Спытаў павольна:
Як там маці?
Жывы прычэпшчык-гарманіст?.

Ўсё абышлося.
Пэўна, шчасце
На свеце белым ўсё-ткі ёсць...
Калі жыццё на дні раскласці —
Дае больш шанцаў маладосць.

І вось на танцах зноў шчасліва,
Павольна пары кружаць вальс.
У круг вас цягнуць, сарамлівых,

Дзяўчаты, што старэй за вас.
Таму даруйце жонцы ў сварцы,
Што нібы стукне абухом:
Я не пайшла б за падшыванца

Вайна забрала жаніхоў...
Старэеце, бо час няўмольны
Сваё адвечнае бярэ...
А вашы ўнукі —
Ім прыволле! —
У вайну гуляюць на двары...

## ЗАДОРАЎКА

Задорыць дарамі лесу
На святы гасцей Задораўка.
У вайну ж частавала агрэсараў
Куляй свінцовай здорава.

Таму ў сорак трэцім каты,
Прапахлай верасам раніцай,
Прыехалі гуртам сватаць —
Ты стала агню абранніцай.

Да самае ночы клубамі
Круцілі ў неба заручыны,
А лес, набрынялы грыбамі,
Твой лёс раздзяляў пякучы.

Ды з гулам баёў да вытокаў
Зноў ворагі зграяй рушылі,
А веска кляла іх крокі,
Попелам след зацярушвала.

Згадаюць за чаем тэта
Жанкі і да слёз расчуляцца...
Хай будзе заўсёды светла
У вёсцы з адзінай вуліцай!

***

Было чацвёра
Сыноў у маці,
Не знала гора
У роднай хаце.

Мясіла цеста
З мукі пшанічнай,
Было тут цесна
За стол садзіцца.

Ды ўсім хапала
Баршчу і хлеба,
Бо маці знала
Усе патрэбы.

...Цяпер нікога
Не кліча з горкі:
Гарацць над форткай
Чатыры зоркі.

І больш не цесна
За стол садзіцца...
— Была б нявестка, —
Старой не спіцца.

СУСТРЭЧА З ВЕТЭРАНАМІ

Я — сорак пяты год далёкі,
Іду да вас сюды ў госці —
З трывожнай вашай маладосці
Мае чуваць сягоння крокі.
Вы пастарэлі.
Я ж, здаецца,
Такі, як быў вясеннім раннем,
Калі на кожным скрыжаванні
Вітаў усіх з адкрытым сэрдцам.
Спачатку мы, давайце, нізка
Галовы схілім перад тымі,
Хто захлынуўся ў чадным дыме
Ці стаў высокім абеліскам.
А потым мне скажыце шчыра,
Спакойна зараз на планеце?
Ці ўсім пароўну сонца свеціць,
Ці ўсе жывуць шчасліва, у міры?
Мне ўсё цікава.
Як далёка
Зайшлі з тым атамам маньякі,
Хто Хірасіму й Нагасакі
Спаліў пры мне ў імгненне вока?..
Кап'ё важней цяпер ці пэндзаль?
Скажыце шчыра, ветэраны,
Калі ж вам сыплюць соль на раны —
Мне месца дайце ў шарэнзе!

## БАБУЛЬКІ

- Упадзеш жа, кажу: высока!
Гэта ж трэба, такі блазнюк.
І ў каго ты ўдаўся няўрокам,
Неўгамонны такі ўнук?

Супакоіла. Зноў размова
Паяднала сівых бабуль:
- Не прывыкну на месцы новым
І па вёсцы сумую дасюль.

- І мне сумна сядзець без справы.
На балконе — не той прастор.
Глянь: у скверы жаўцеюць травы —
Гэта мне, як прыроды дакор.

- Во, схадзіла, купіла вішняў...
- Так, нятанна накрыць сталы.
А там сёння, напэўна, выйшлі
На поплаў стары і малы.

А як вецер зноў не паверне,
Дык праз тыдзень касі ячмень:
Наліваецца хутка зерне,
Як не спаліць з вясны сухмень.

Не забуду, як у сорак трэцім
Схавала я пяць сярпоў,
А немцы спалілі ў клеці
І іх, і маіх бацькоў...

Слабыя бабуль ужо рукі —
Жыццё свае ўсё-ткі ўзяло.
У горадзе няньчаць унукаў,
Адумкі ўсе — пра сяло.

## А ЗАЎТРА ШТО?

А так вядзецца заўсёды
Ў грэшных адвеку людзей:
Сягоння на клёшы мода,
А заўтра — на смерць дзяцей.

Сягоння вам “кошкі-мышкі”,
А потым — бяздушша стынь:
Было ж так — палілі кніжкі,
А потым — з людзьмі Хатынь.

Было ж, што кідалі цацку,
А дзеўчынцы — пяты гадок,
І хоча пра ўсё дазнацца...
Раптам выбух... Касіца... Пясок...

Сягоння руйнуюць Чылі,
А заўтра — другі В’етнам.
Учора людей травілі,
А заўтра што стукне вам?

ЗЯМЛЯ І МЕТАЛ

А зямля і на пах не прымае металу,
Пераканаўся ў гэтым яшчэ я змалку,
Калі шукаючы прынаду для рыбалкі,
Чаго на вочы нечакана не трапляла.

Яна нікольки не шкадуе таямніцы,
І з глыбіні кароткага штыка рыдлёўкі
Усім раздорвае іржавыя асколкі,
Якімі і сама, відаць, не ганарыцца...
А колькі ў ёй цвікоў?..
Агільзы,
кулі?
Здараецца,
трапляюць выпадкова клады...
Але часцей паўсюль ашмоткі ад снарадаў,
Што ў час вайны гвалтоўных мэт не дасягнулі...
Адзіная ёй падабаецца імпрэза,

Адмовіць у якой скрозь не хапае волі,
Калі вясной на неўзараным полі
Шчыруе плуг,
таксама зроблены з жалеза!..

***

Нечакана
ў месяцы лютым,
калі холаду
сіні смутак
яшчэ доўжыцца,
сілу мае
і на струнах
капежных грае,
спыталася
сонца ў раніцы:
“Вы хоць вясну
адчуваеце?..”
А для зімы
тыя словы,
Гэта прысуд, —
канчатковы...

***

К нам вясна прыходзіць,
Як заўсёды рана,
З першым яркім сонцам,
Выраем шпакоў.
Апранае дрэвы
Зеленню старанна,
Вызваляе рэчку
З ледзяных акоў.
К нам вясна прыходзіць
З глебаю пахучай,
З гулам басавітым
Моцных трактароў,
Калі сейбіт першы
Цвёрда і рашуча,
Радасна ступае
На прастор палёў.

***

Вясновая ночка
Павольна, нясмела,
Як быццам дзяўчына
На шлюбнае ложа,
Ізноў на зямлю
Асцярожна прысела –
Адкуль столькі смеласці,
Уцяміць не можа.
А зорачкі — вочы
Дрыжаць сарамліва,
Здаецца, хвілінка —
І прыснуць каметы,
Як кропелькі — слёзы,
І хвалі — разлівы
Упадуць з шыпеннем...
І змоўкнуць паэты.

# ЦВІЦЕ МАГНОЛІЯ

Дыназаўраў равесніца —
Дрэва поўдня — магнолія
Зацвіла і нявесціцца
Сёння ў парку ў Гомелі.

Свежай белай пяшчотаю
Ўсе галінкі расквечаны!
І, адклаўшы ўсе клопаты,
Зачараваны вечнасцю,

Я любуюся квеценню,
Пах лаўлю з асалодаю.
Як раней не прыкмецілі:
І адкуль усе родам мы...

***

Пакліч мяне, раптоўны ўспамін,
У сад, што тоне ў кіпені пялёсткаў,
Дзе тонкім пахам пеніцца язмін
І нас тактоўна вабіць прэч за вёску...
Шкада, нішто не вечна на зямлі:
Аднойчы пад дажджом язмін пажухнуў,
На кветках іншых жвавыя чмялі,
І два вакны на ўскраіне патухлі...
Маёй сядзібы вокны...
Сад стары
Карчуюць: ад язміну нуль карысці...
З трывогай я ўзіраюся ў муры,
Дзе ўспаміны нашы пасяліліся...

ЯБЛЫНІ ЗАЦВІЛІ

На Радзіме спрадвеку ў маі дажджыць,
Калі яблыні квеценню пеняцца,
Бо прыродзе шкада цёплы дзень падарыць,

І зіма паўзабытая вернецца...
І яна, бы прыходзіць ізноўку да нас,
Усцілаючы глебу пялёсткамі,
Што па колеру снегу падобны якраз,

Толькі маюць адрозненне простае:
Снег, па-сутнасці, гэта — заўсёды вала...
А кветкі не толькі зрок радуюць:
З іхняй завязі ў нашых сцішэлых садах
Выспяваюць да верасня яблыкі!

ЛЕЛЬЧЫЦКІ ЦАР-ДУБ

Вось бачыш, брат, і ты стаў знакамітасцю:
Абмералі, паставілі драўляны тын...
Каб у людзей раней хапіла літасці,
Ты панаваў бы ў лесе сёння не адзін.

Не дакучалі продкам вы паклёпамі,
Грамы трывалі, снег і маразы.
Ды век заканчвалі звычайнай клёпкаю
Ці гнулі з вас увосень палазы.

Таму й адзін ты сёння ў снежнай замяці,
Табе нялёгка хмары падпіраць,
І ўсе вякі пражытыя — у памяці,
А жалуды — нашчадкам сабіраць.

Цябе заносяць зараз у шматтомнікі,
Нібы рэптылій, птушак ці кусты.
Ды навошта прыродзе помнікі
Пакуль на Палессі ўладарыш ты!

***

Ветрык пяшчотны,
Каханнем сагрэты,
Блытае косы
Сястрычак-бяроз,
Шэпча ім казкі
Пра цёплае лета,
Прэч адганяе
Кудлаты мароз.
Чыстых пачуццяў
Стрымаць ён не можа —
Плешчуцца словы,
Бы хвалі ў рацэ,
Ён на галінках
Пра шчасце варожыць,
Быццам цыганка
Па нашай руцэ.
Толькі не ведае
Ён, адзінокі,
Колькі ўжо год
Падабаецца ім
Волат мясцовы —
Пад неба высокі —
Дуб-прыгажун
Непакорствам сваім.

ЗАЛІНЕЙНЫ РАЁН

Залінейны драўляны раён —
Хатам цесна, але ж затое
Каля кожнай каштан або клён
Кучаравай трасе галавою.

Тут у нейкіх хвілінах хады
Ад цагляных заблытаных нетраў
Асляпляльна цвітуць сады
І стэрыльйнае хмеліць паветра.

Я заўсёды прыходжу сюды
Адпачыць пасля летняй спякоты
І паслухаць, як шпак малады
Адпрацоўвае першыя ноты...

ШАЎКОЎНІЦА

У Гомелі ёсць вуліца адна,
Якая мне начамі часта мроіцца,
Чый пах вясной я выпіў бы да дна,
Як зацвітае сціплая шаўкоўніца.

Якой прыгожай ты, дзятве, была,
Што ў сны прыходзіш нават і даросламу,
Бо ў Целяшах за хатаю расла
І частавала ягадамі ўдосталь нас.

І сёння на зубах іх церпкі смак
На гарадской я адчуваю вуліцы...
І хоць я думкі адганяю ўсяляк,
Ды не магу, каб зноўку не расчуліцца.

## АДЗІНОКАЙ БЯРОЗЦЫ НА АЎТАСТАЯНЦЫ

### ВОСЕНЬ

О, як ты віхурыла б
зараз у танцы ў гурце такіх,
як сама беластволых,
а мерзнеш сіроткай
на аўтастаянцыі,
нібы вартаўніцы
выконваеш ролю.
Наўкол гаражы
ды асфальт раўнадушны,
машыны снуюць,
абдымаючы чадам...
Няўжо не самотна табе
і не скрушна
адной на халодных
вятрах лістападу?..
І хто той бяздушны,
што гэтак зняволіў
і вымусіў жыць
за высокім парканам?
Няўжо й сапраўды
Выбірае нас доля,
а мы — проста служкі
дабра ці падману?..

ЗІМА

У колер снегу тонкі стан,
а, можа, і бялейшы,
бо ледзьве тут аўто пастаў –
ён сам чарнее першым.
А што расце, як на дражджах,
магчыма, і нядрэнна,
бо ад марозу па начах
ахоўвае карэнне.
Вось толькі сівер, каб яму
не спалася і ўлетку!..
Як пераждыць адной зіму,
зняволенай у клетку?..

Зрабіць бы толькі смелы крок,
каб вырвацца з-за плоту!..
Ды не пускае, як знарок,
Змяюка-адзінота...

ВЯСНА

Што гэта робіцца,
што гэта дзеецца:
катушкі-завушніцы
да лісцейка клеюцца?!.
Хай і драбнюткія,
кволыя-кволыя,
ты ж, сірацінка,
цяпер больш не голая!..
Новы убор твой
такі, што не снілася!..
І аўтастаянка —
Аж засвяцілася!
Нават вадзіцелі
ранкам з ахвотаю
друз падмяталі,
нібы на суботніку!..
Кот прыблудзіў
і на сонейку грэецца!
Што тэта робіцца,
што гэта дзеецца?..

ЛЕТА

А вось лета —
не восень:
цвітуць васількі,
сонца лагодна
лашчыцца з рання,
і ў лістоце тваёй
маладыя шпакі
ва ўзаемным
клянуцца каханні!
І прызначаюць
спатканні!..
І хто б мог падумаць –
на аўтастаянцы!
Бо ў горадзе шэрым,
людным і цесным,
каб мілавацца
вочы ў вочы,
дзе яшчэ знойдзеш
лепшае месца,
як не ў кроне тваёй,
днём і ноччу?..
І настрой ім
ніхто не азмрочыць
на аўтастаянцы...

***

Я сачыў за ёю і не верыў,
Як раптоўна ў блакіце веснім
Плямаю чарнільнай на паперы
Расцяклася хмара ў паднябессі.

А была ж пушынкай кучаравай,
Ды ледзь толькі ветрыкам дыхнула,
Разраслася ўлева і направа,
Што і сонца бохан заглынула.

...Хоць зямля — не неба, ды таксама
Шчасця век становіцца кароткім,
Калі раптам расцякуцца плямай
Ветрам раздзімаемыя плёткі...

***

Не на час — на сябе раззлаваны
Сёння я. А прычына адна:
Абскакала на шпаркім буланым
І спяшаецца ў лета вясна.

Я ж яшчэ ў сакавіцкім разводдзі
Абмінаю густы крыгаход,
Быццам нечым вясне не ўлагодзіў,
Ці не ў нораў ёй мой радавод?

А мо проста не тое надвор’е
Памылкова ўручыла ключы,
Што так сонечна ўдзень на падвор’і
І надзіва марозна ўначы?

І калі яны прыйдуць да згоды
Дзень і ноч, свой хаваючы твар?..
А мо проста сама прырода
Мой гартае не так каляндар...